# СКАРБОВЫ ТРЫБУНАЛ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

М. А. Шмігіра

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

З узнікненнем дзяржаўнасці на беларускіх землях судовыя спрэчкі, як і ў ранейшы перыяд, працягвала разглядаць абшчына. Суд ажыццяўляўся ўсім грамадствам («мірам») шляхам звода, з дапамогай сведкаў (відакоў і послухаў) і інш. Галоўнай мэтай судовага следства было высвятленне волі Бога (у дахрысціянскі перыяд – волі багоў), менавіта таму пры неабходнасці прымяняліся ардаліі [1]. Суд у той час існаваў для простых людзей, таму суддзямі былі тыя ж простыя людзі. З цягам часу мы назіраем развіццё судовай сістэмы, набыццё тэхнік афіцыйнай працы з судовымі дакументамі і зведкамі аб абставінах тых ці іншых спраў. Аднак на сенняшні дзень у гісторыка-прававой навуцы не хапае пэўных зведак аб некаторых судовых органах, аб існаванні якіх есць толькі нешматлікія згадкі ў рознапланавых крыніцах.

У перыяд Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) існавалі ўжо пэўныя судовыя органы. Дадзенае даследаванне прысвечана Скарбоваму Трыбуналу, – спецыялізаванаму судоваму органу часоў Рэчы Паспалітай. Гэта быў адміністрацыйна-судовы орган у складзе земскага і дворнага падскарбіяў, аднаго сенатара і сямі шляхціцаў, абраных на сойме. У кампетэнцыю Скарбовага Трыбунала ўваходзіла вынясенне рашэнняў па злачынствах, здзейсненых супраць казны дзяржавы і службовых асоб, каторыя супрацьпраўна дзейнічалі датычна казны дзяржавы, а таксама разгляд спрэчак паміж купцамі і спраў, звязаных з гандлёвымі кантрактамі і вэксалямі. Ен ажыццяўляў і канфіскацыю тавараў, а таксама разглядаў справы, якія датычыліся войска, скаргі цывільных асоб на вайскоўцаў і наадварот. Войска давала яму справаздачу аб грашовых прыбытках і расходах. Скарбовы Трыбунал праіснаваў да 1726 г. [2, с. 163], пасля чаго пастановай Гродзенскага сойма частка яго функцый была перададзена Галоўнаму літоўскаму трыбуналу [3, с. 107–108].

Звернемся да перадумоў стварэння і прычын яго далейшай дзейнасці. Супрацьстаянне палітычных груповак у ВКЛ у XVII ст. праяўлялася ў большай ступені ў неабходнасці кантраляваць дзяржаўныя фінансы. У 1697 г. пасля збору падаткаў ад скарбу органам шляхецкага самакіравання, гэтая праблема выяўляецца яшчэ больш. Менавіта запазычанасць перад войскам была стрыжнем гэтай праблемы. Трэба было афіцыйна і легітымна наладзіць працэс выплаты запазычаных грошай.

Скарбовы Трыбунал быў створаны ў 1609 г. [2, с. 163]. Адбылося гэта на пацыфікацыйным сойме У хуткім часе пасля яго стварэння высветлілася, што частка шляхты ВКЛ (рэспубліканцы) не згодна з такім рашэннем і нават катэгарычна адмаўляе, што сойм прыняў такую пастанову. Гэта прывяло да

зацяжнога канфлікту, значэнне якога ў шэрагу падзеяў пераломнага для ВКЛ 1700 г. патрабуе высвятлення. Казімір Ян Сапега (вялікі гетман) быў супраць прапанаванай кампетэнцыі Скарбовага Трыбунала (супраць верыфікацыі падаткаў з 1667 г., а не з 1690 г., бо яго брат, вялікі падскарбі, ужо склаў на сойме справаздачу пра сваю дзейнасць за ранейшы перыяд, таму няма сэнсу ўключать гэтыя справы ў задачы Скарбовага Трыбунала). Таксама праблемная сітуацыя складалася вакол канстытуцыі аб Скарбовым Трыбунале: подпіс Шчыта (пасла ад ВКЛ) пад арыгіналам канстытуцыі адсутнічае. Але з пазнейшых яго выказванняў вынікае, што ён увесь час падтрымліваў скліканне і дзейнасць Трыбунала, а рэспубліканцы, якія падтрымлівалі гэтую ідэю на сойме, потым змянілі сваю думку [4, с. 42]. Віцебская шляхта сцвярджала пазней, што апратэставала на рэляцыйным сойміку дзейнасць Скарбовага Трыбунала. Пад час чытання канстытуцыі аб Скарбовым Трыбунале з пратэстам супраць яе выступіў шляхціч Ян Няскевіч. Дырэктар яго нібыта ўціхамірыў, і соймік прадоўжыўся [5, с. 40]. Таксама другі з дэпутатаў, Крыштаф Камароўскі, непасрэдна ў дзень адкрыцця Скарбовага Трыбунала засведчыў, што пры чытанні канстытуцыі пратэстаў не было. На сойміку, які склікалі менскія паслы 13 кастрычніка, удзельнікі сойміка склалі пратэстацыю, у якой заявілі, што канстытуцыя аб Скарбовым Трыбунале на сойме не толькі не была зацверджана, але і не выносілася на разгляд. На пачатак Скарбовага Трыбунала ў Вільню былі накіраваны паслы з мэтай апратэставаць яго дзейнасць (менскі кашталяніч Юзаф Антоній Пузына, ваўкавыскі стольнік Ян Эмануэль Талочка і Крыштаф Гамбровіч). Незадаволенасць шляхты выклікала канстытуцыя аб Скарбовым Трыбунале, якая расцэньвалася як парушэнне каэквацыі. Як прайшоў рэляцыйны соймік у Мсціславе, невядома, але па выніках яго ў Вільню на адкрыццё Скарбовага Трыбунала выехалі паслы, Крыштаф Самуэль Гедройць і мсціслаўскі канюшы Марцін Казімір Панятоўскі. Ім было даручана пратэставаць супраць яго склікання і дзейнасці [5, с. 54]. Галоўнай праблемай аб афіцыйным стварэнні і працы дадзенага органа была нізкая легітымнасць. Але праблема цалкам у недастатковай меры даследавана. У большасці соймавых дыярыушаў звесткі пра зацвярджэнне канстытуцыі аб Скарбовым Трыбунале ВКЛ адсутнічаюць [4 , с. 42].

З трэцяй спробы (з-за адкладання сойміка), 29 кастрычніка паслам удалося скласці справаздачу. Дэпутатам на Скарбовы Трыбунал тут быў абраны віленскі земскі суддзя Казімір Аляксандр Валовіч. Быў абраны таксама камісар – відаць, з даручэннем завесці на гэты Трыбунал падатковую дакументацыю (нехта Бартноўскі, “шляхціч вельмі мізэрнага дастатку”) [5, с. 40].

Праблемы у вызначэнні пасад Скарбовага Трыбунала выраШаліся на наступных сойміках. 5 кастрычніка, здарыўся раскол. Адбыліся два соймікі, на якіх, па некаторых звестках, былі абраныя двое камісараў (дэпутатаў) Скарбовага Трыбунала. Адным з іх быў аршанскі гродскі суддзя і войскі Мікалай Станіслаў Галінскі, які ўдзельнічаў у паседжаннях; хто быў другі,

невядома. Рэляцыйны соймік у Пінску быў склікан паслами ў адпаведнасці з дэкларацыяй на 22 верасня. Дэпутатам Скарбовага Трыбунала шляхта абрала Стафана Кужанецкага, якому было даручана ўдзельнічаць у яго працы, калі на ім не будуць разглядацца старыя нядоімкі. Менскія паслы склікалі шляхту свайго павета на рэляцыйны соймік 13 кастрычніка. На сойміку абралі паслоў на Скарбовы Трыбунал (холмскі гараднічы Павел Станіслаў Свянціцкі і менскі гродскі суддзіч Давід Міцкевіч), якім даручылі пратэставаць супраць яго адкрыцця і дзейнасці [5, с. 47]. Пасля каэквацыі, у Вільні (у тым ліку) на грамнічным сойміку 3 лютага 1698 г. былі абраныя скарбовыя суддзі. На другі дзень прайшоў рэляцыйны соймік. Былі абраны скарбовыя суддзі "згодна з духам новага закону каэквацыі і канстытуцыі каранацыйнага сойма, якая хоча, каб па ваяводствах і паветах з'явіліся скарбовыя, або фіскальныя, суды". Было абрана 6 суддзяў пры земскіх і гродскіх урадніках. Кіраваць гэтым судом абралі Міхала Сясіцкага. У Троках абранне скарбовых суддзяў, адміністратараў падаткаў (гіберны, чопавага і шэлезнага) вядома толькі з 1699 г. Было абрана 6 скарбовых суддзяў, якія разам з судовымі і несудовымі земскімі і гродскімі ўраднікамі сфармавалі склад скарбовага суда. У Гародні ў 1698 г. адбыўся падзел грамнічнага сойміка на два альтэрнатыўных сойміка. У наступным 1699 г., калі зноў дайшло да падзелу грамнічнага сойміка і правядзення двух альтэрнатыўных. Тады і прыхільнікі "рэспубліканцаў" і прыхільнікі Сапегаў абралі скарбовых суддзяў, павятовых ротмістраў і паборцаў падаткаў. У Мінску грамнічны соймік 1698 г. працягваўся 4 дні, дзе (у тым ліку) было вырашана, каб заставаўся дзейнічаць скарбовы суд, які быў абраны яшчэ на рэляцыйным сойміку паслоў з элекцыйнага сойма 1697 г. Брэсцкая шляхта сабралася на соймік з адкладу 2 верасня 1698 г. згодна пастановам каэквацыі і каранацыйнага сойма, дзе (у тым ліку) быў абраны склад скарбовага суда ў колькасці 10 суддзяў [6].

Па выніках паслясоймавай кампаніі можна меркаваць, што пазіцыю Сапегаў па галоўным пытанні – склікання Скарбовага Трыбунала – падтрымалі дзевяць соймікаў: віленскі, вількамірскі, ковенскі, смаленскі, полацкі, слонімскі, ваўкавыскі (з нешматлікім пратэстам), віцебскі (але, відаць, з пратэстамі) і мазырскі.

Як лічыць А. У. Мацук, акт "ураўнавання правоў" (каэквацыі) 1697 г захоўвае толькі ўзгадку пра павятовыя скарбовыя суды, якія "па ваяводствам і паветах маюць судзіць згодна парадку Польскай Кароны". Гэта паўтаралася ў пастановах сойма 1699 г. Галоўнай мэтай "рэспубліканцаў" такімі дзеяннямі па ўніфікацыі скарбовай сістэмы Кароны і Княства было паменшыць уплывы магнатаў, што падкрэслівае яго кантрольныя функцыі. Увядзеннне гаспадарчага сойміка і аддача пад яго ўладу новастворанных скарбовых судоў павялічвала ўплывы шляхты за кошт магнатаў, якія займалі ўрад падскарбія і мелі моцныя ўплывы ў Скарбовым Трыбунале [6].

У дзень адкрыцця Галоўнага Трыбунала 26 красавіка рэспубліканцы пад кіраўніцтвам Міхала Казіміра Коцела сабралі ў Вільні з'езд шляхты розных паветаў і прынялі на ім маніфест, скіраваны супраць Сапегаў і палявога

гетмана Слушкі. Галоўнай падзеяй у гэты час быў напад аховы Сапегаў на князёў Вішнявецкіх, які адбыўся напярэдадні і які ўдала выкарысталі ў сваёй прапагандзе рэспубліканцы. Але адной з галоўных прычын, якія выклікалі іх незадаволенасць, называлася і дзейнасць Скарбовага Трыбунала. 10 траўня пачалася другая кадэнцыя Скарбовага Трыбунала, але ўжо 17 траўня ён быў лімітаваны да 20 лістапада гэтага ж года. У акце лімітацыі тлумачылася, што гэта робіцца ў сувязі з неабходнасцю ад'езду сенатараў, асабліва двух гетманаў, на раду ў Варшаве, дзе будзе абмяркоўвацца "знешняя небяспека" (насамрэч – удзел у вайне са Швецыяй). На самай справе ўсё гэта было вынікам усё тых жа дамоўленасцяў з Радзівіламі і дваром. Быў асуджаны ўчынак інстыгатара ВКЛ Станіслава Яна Рукевіча, які ўхіліўся ад выканання абавязкаў на мінулай кадэнцыі. Акрамя гэтага, было прызнана, што ён не меў права спалучаць дадзены ўрад з абавязкамі павятовага камісара, зборшчыка падаткаў, скарбовага суддзі і дырэктара скарбовага суда. У сувязі з гэтым Скарбовы Трыбунал звярнуўся да караля з просьбай пазбавіць яго пасады за злоўжыванні і прызначыць у ВКЛ новага інстыгатара. Скарбовы Трыбунал быў лімітаваны, але не адменены. Яшчэ ў пачатку чэрвеня супраць яго ў Галоўным Трыбунале дэпутаты-рэспубліканцы ініцыявалі пратэстацыю, але, мабыць, не сабралі для яе дастаткова галасоў. Пасля паражэння Сапегаў у бітве пад Алькенікамі на з'ездзе шляхты ў лагеры паспалітага рушання 24 лістапада 1700 г. была прынята т. зв. Алькеніцкая пастанова, адным з палажэнняў якой была адмена Скарбовага Трыбунала і скасаванне ўсіх яго рашэнняў [4, с. 71].

Таксама ўпамінаецца Скарбовы Трыбунал падчас усталявання правіл функцыянавання Ваеннай камісіі ВКЛ. На каранацыйным сойме 3 снежня 1764 г. было абвешчана аб стварэнні Ваеннай камісіі ВКЛ. Быў урэгуляваны фінансавы складнік працы камісіі – яе сябры за сваю дзейнасць атрымлівалі ўзнагароду на тых жа ўмовах, што і дэпутаты Скарбавога Трыбунала ВКЛ, згодна Канстытуцыі Сейма аб усеагульнай каранацыі караля [7].

Прыкладам функцыянавання Скарбовага Трыбунала будзе з'яўляцца палітычная спрэчка, звязаная з грашыма мінскага старасты Яна Завішы, які, як пішацца ў арыгінальным архіўным запісе, быў абраны каралеўскім рэзідэнтам. Сапегі яго не ўспрымалі, але той быў пад абаронай караля. Потым Завіша стаў дэпутатам, але пячатку так і не атрымаў, пасля доўгіх спрэчак з Станіславам Шчукам. Такім чынам ён і стаў пераможцам у гэтай спрэчцы. З запісаў дзённіка Завішы бачна, што Завіша атрымаў 40 тыс. талераў, але даследчыкі лічаць што ў гэтым запісе была зроблена памылка. Першая з квітанцый, выстаўленая 27 ліпеня 1699 г. у Варшаве, загадвае літоўскаму падскарбію выплаціць Завішу з літоўскай казны 4 тыс. талераў, атрыманых па новых падвышаных пошлінах. Справа пра грошы, якія ішлі ў казну з імпартных тавараў. На адваротным баку квітанцыі пазнака ад 16 лютага 1712 г. аб уключэнні яе ў справы трыбунала, падпісаная літоўскім канцлерам Каралем Станіславам Радзівілам. Яшчэ адна ідэнтычная пазнака ад 3 чэрвеня 1713 г. падпісана брэсцкім ваяводай Уладзіславам Юзафатам

Сапегам. Абодва ў згаданых гадах з’яўляліся маршалкамі Скарбовага Трыбунала. Пры гэтым ад імя Завішы дзейнічаў патрон Якуб Чарняўскі, упіцкі гараднічы [8]. Такім чынам, па выніку разгляду квітанцыі Скарбавога Трыбунала, у даследаваннях функцый дадзенага дзяржаўнага органа знаходзім карэктную інфармацыю аб выплатах, нават пры наяўнасці памылкі ў дзённікавых запісах, што неабходна для адпаведна правільнай працы з архіўнымі дадзенымі. Даследчык А. Шкрыпец спасылаецца таксама на папярэднюю квітанцыю Скарбовага Трыбунала, каб абгрунтаваць меркаванні наконт палітычных спрэчак і некаторых сяброўскіх саюзаў. У гэтым жа годзе 27 кастрычніка на гродзенскай сесіі Завішы пацвердзілі, што абавязацельства не было выканана ні падскарбіем, ні зборшчыкам пошлін. Кацэлу яшчэ раз загадалі падпарадкавацца распараджэнню трыбунала і выплаціць названую суму, аднак безвынікова. У канцы студзеня 1712 г. Завіша прыбыў на Скарбовы Трыбунал, дзе яшчэ раз узняў пытанне аб сваіх грошах. Маршалкам судоў у той час з’яўляўся канцлер Караль Станіслаў Радзівіл. У выніку 6 лютага быў складзены дакумент, які рэкамендаваў унесці ў матэрыялы справы, што Завіша належных яму грошай не атрымаў. 11 лютага 1712 г. камісарамі Скарбовага Трыбунала, прызначанымі Варшаўскай вальнай радай, быў складзены загад Міхасю Коцелу аб неадкладнай выплаце менскаму старасце належнай яму сумы. Яго падпісалі Караль Станіслаў Радзівіл і Канстанцін Бжастоўскі. Гэты дакумент таксама змяшчае запіс ад 1713 г. з подпісам Уладзіслава Сапегі, брэсцкага ваяводы. Ліст быў дастаўлены «абскарджанаму» 9 верасня і ўручаны ў прысутнасці Яна і Стэфана Завадскіх з неадкладным адказам. 24 верасня, Завіша распісаўся ў атрыманні 804 тымфаў, перасланых літоўскім падскарбіем. На гэтым выплаты спыніліся [8]. Потым даследчык яшчэ спасылаецца на дакументы Скарбовага Трыбунала, якія пацвярджалі запісы у дзённіку Завішы, аб тых шматлікіх грашовых стратах.

Назіраецца адсутнасць метадаў легальна абгрунтаваных прымусаў да выканання рашэнняў Скарбовага Трыбунала. Выяўляецца сістэма прадстаунітства законных інтарэсаў праз патрона. Бачны бюракратызм і фармалізм працэсу. На прыкладзе работы па канкрэтнай грашовай справе назіраем, што выканальнасць судовых рашэнняў дрэнная (па вышэйсказанаму, цяжка было дабіцца афіцыяльнага замацавання праблемы, каб мець магчымасць патрабаваць яе выканання). Пасля скасавання Скарбовага Трыбунала, у 1726 г. пастановай Гродзенскага сойма частка яго функцый была перададзена Галоўнаму літоўскаму трыбуналу. Не працягнуў сваю працу Скарбовы Трыбунал менавіта з-за таго, што спрэчкі па яго ўтварэнню ўзмацнілі палітычныя канфлікты ў ВКЛ і стала адной з прычын іх крывавай развязкі ў бітве пад Алькенікамі.

## Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Доўнар, Т. І. Судова-працэсуальная дзейнасць у старажытных беларускіх дзяржавах [Электронны рэсурс] / Т. І. Доўнар – Рэжым доступа : https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/186418/1/22-25.pdf. – Дата доступа : 17.03.2024.
2. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік / Т. І. Доўнар. – 2-е выд., выпр. І дап. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2021. – 431 с.
3. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : Вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 319 с.
4. Віцько, Д. В. Скарбовы Трыбунал ВКЛ 1700 года / Д. В. Віцько // Беларускі гістарычны агляд. – 2019. – С. 39–72.
5. Віцько, Д. В. Паслясоймавая кампанія 1699 г. у Вялікім Княстве Літоўскім / Д. В. Віцько // Беларускі гістарычны агляд. – 2020. – С. 27–58.
6. Мацук, А. У. Развіццё шляхецкага самакіравання і станаўленне гаспадарчага сойміка ў ВКЛ у канцы XVII ст. – пачатку XVIII ст. [Электронны рэсурс] / А. У. Мацук. – Рэжым доступа : https://elib.psu.by/bitstream/123456789/24444/3/104-111.pdf. – Дата доступа 17.03.2024 – Дата доступа : 17.03.2024.
7. Черепко, С. А. Армия Великого Княжества Литовского в свете военной реформы 1764 – 1766 гг. [Электронный ресурс] / С. А. Черепко. – Режим доступа : https://cyberleninka.ru/journal/n/vestnik-polotskogo-gosudarstvennogo-universiteta-seriya-a-gumanitarnye-nauki?i=1132892 – Дата доступа : 17.03.2024.
8. Шкрипец, А. Деньги на вознаграждение работ и убытков для минского старосты Кшиштофа Завиши и его спор с литовскими подскарбиями в первой четверти XVIII в. [Электронный ресурс] / А. Шкрипец. – Режим доступа : https://reader.lanbook.com/journalArticle/560893. – Дата доступа: 17.03.2024.